УДК 811.161.3

# СУФІКСАЛЬНАЕ ЎТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКІХ ФІЛАСОФСКІХ І САЦЫЯЛАГІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

***М. У. ГУЛЬ***[1*]

[1*]*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна,*
*вул. Міцкевіча, 28, 224016, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*

Аналізуецца беларуская філасофская і сацыялагічная тэрміналогія: гісторыя яе фарміравання, ступень кадыфікаванасці, спосабы ўтварэння. Вызначаюцца найбольш прадуктыўныя словаўтваральныя тыпы ў межах суфіксацыі на матэрыяле лексікаграфічных прац, выдадзеных з 1920-х гг. да 2011 г. Выяўлены самыя прадуктыўныя для беларускіх філасофскіх і сацыялагічных тэрмінаў словаўтваральныя фарманты. Адзначана, што на сучасным этапе расце прадуктыўнасць запазычаных суфіксаў, што звязана з агульнай тэндэнцыяй да інтэрнацыяналізацыі. Паказана, што некаторыя тэрмінаўтварэнні 1920-х гг. выйшлі з актыўнага ўжытку.

***Ключавыя словы:*** прадуктыўны; прадуктыўнасць; сацыялагічныя тэрміны; словаўтваральны тып; суфікс; словаўтваральны фармант; філасофскія тэрміны.

# СУФФИКСАЛЬНОЕ ОБРАЗОВАНИЕ БЕЛОРУССКИХ ФИЛОСОФСКИХ И СОЦИОЛОГИЧЕСКИХ ТЕРМИНОВ

***М. В. ГУЛЬ***[1)]

[1)]*Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина,*
*ул. Мицкевича, 28, 224016, г. Брест, Республика Беларусь*

Анализируется белорусская философская и социологическая терминология: история ее формирования, степень кодифицированности, способы образования. Выявлены наиболее продуктивные словообразовательные типы в рамках суффиксации на материале лексикографических работ, издававшихся с 1920-х гг. по 2011 г. Выявлены самые продуктивные для белорусских философских и социологических терминов словообразовательные форманты. Отмечено, что на современном этапе растет продуктивность заимствованных суффиксов, что связано с общей тенденцией к интернационализации. Показано, что некоторые терминообразования 1920-х гг. вышли из активного употребления.

***Ключевые слова:*** продуктивный; продуктивность; социологические термины; словообразовательный тип; суффикс; словообразовательный формант; философские термины.

**Образец цитирования:**
Гуль М. У. Суфіксальнае ўтварэнне беларускіх філасофскіх і сацыялагічных тэрмінаў // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. 2017. № 1. С. 58–65.

**For citation:**
Hul M. U. Suffix word formation of Belarusian philosophical and sociological terms. *J. Belarus. State Univ. Philol.* 2017. No. 1. P. 58–65 (in Belarus.).

**Автор:**
***Мария Владимировна Гуль*** – аспирантка кафедры белорусского языкознания и диалектологии филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Н. Г. Пригодич.

**Author:**
***Maryia Hul***, postgraduate student at the department of Belarusian linguistics and dialectology, faculty of philology.
*boxformail35@mail.ru*

# SUFFIX WORD FORMATION OF BELARUSIAN PHILOSOPHICAL AND SOCIOLOGICAL TERMS

***M. U. HUL***[a]

[a]*Brest State University named after A. S. Pushkin, Mitskevicha street, 28, 224016, Brest, Republic of Belarus*

The article dwells on Belarusian philosophical and sociological terminology, the history of its formation, the level of its codification and the ways of derivation. The aim is to reveal the most productive suffix derivation types for Belarusian sociological and philosophical terms. The research materials were derived from lexicographical works from the 1920s up to 2011. The most productive word-formation formants were singled out after the analysis. The productivity of the word-formation suffixes has recently increased due to the general tendency to internationalization. Some terms coined in the 1920s left the active vocabulary of the Belarusian language.

***Key words:*** derivation type; philosophical terms; productive; productivity; sociological terms; suffix;word-formation formant.

Мова навукі не мае спецыяльных спосабаў утварэння новых тэрмінаў: «У тэрміналагічным словаўтварэнні актыўна выкарыстоўваюцца ўсе спосабы словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы: семантычны, сінтаксічны, марфалагічны» [1, с. 166]. Аднак пры гэтым у ёй выпрацавана ўласная словаўтваральная падсістэма, якая падпарадкоўваецца агульным патрабаванням да тэрміналагічнай лексікі. Як адзначала В. П. Даніленка, тэрміналагічнае словаўтварэнне – заўсёды працэс свядомы, а не стыхійны і яго можна рэгуляваць і кантраляваць. Даследчыца падкрэслівала, што «для тэрміналагічных намінацый вельмі важна, наколькі празрыстай з’яўляецца іх унутраная форма»[1] [2, с. 94]. Да таго ж працэс тэрміналагічнага словаўтварэння непасрэдна залежыць ад тыпу паняццяў, для абазначэння якіх распрацоўваюцца тэрміны.

Трэба звярнуць увагу на той факт, што шырокі пласт лексікі, тэматычна звязанай з грамадствам, чалавекам, адносіцца да ліку агульнаўжывальных слоў, якія разам з тым з’яўляюцца тэрмінамі ў пэўных тэрміналагічных сістэмах (напрыклад, жыццё, каштоўнасць, супольнасць і інш.) [1, с. 51]. У розных сферах яны адрозніваюцца аб’ёмам семантыкі, аб’ёмам інфармацыі, тыпам значэння [2, с. 23]. Так, агульнаўжывальнае слова «моладзь» мае значэнне ‘маладое пакаленне, маладыя людзі’ [3, с. 349], а тэрмін «моладзь» – ‘сацыяльна-дэмаграфічная група, якая вылучаецца на падставе сукупнасці ўзроставых характарыстык (14–35 гадоў), асаблівасцей сацыяльнага становішча і пэўных сацыяльна-псіхалагічных уласцівасцей’ [4, с. 43–44].

Тэрмінасістэмы філасофіі і сацыялогіі складваліся на працягу розных гістарычных эпох. Традыцыйна вылучаюцца наступныя этапы развіцця беларускай філасофскай думкі: эпоха Сярэднявечча (да XIV ст.), перыяд гуманістычнага і рэфармацыйнага руху (XVI – першая палова XVII ст.), перыяд феадальна-каталіцкай рэакцыі (канец XVII – сярэдзіна XVIII ст.), эпоха Асветы (апошняя трэць XVIII – пачатак XIX ст.), рэвалюцыйна-дэмакратычны перыяд (сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.), савецкая эпоха [5, с. 22]. У пачатку 1930-х гг. быў створаны Інстытут філасофіі Акадэміі навук БССР. З 1950-х гг. вядуцца даследаванні па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі на Беларусі, а з 1990-х гг. вывучаюцца праблемы логікі і метадалогіі навуковага пазнання (Уладзімір Лукашэвіч, Ядвіга Яскевіч і інш.), сацыяльнай філасофіі (Яўген Бабосаў, Альберт Елсукоў і інш.), гісторыі (Уладзімір Конан, Сямён Падокшын і інш.).

Першыя паняцці сацыялагічнай думкі на Беларусі сталі асэнсоўвацца ў XIX ст. у працах Ф. Багушэвіча, К. Каліноўскага, А. Пашкевіч (Цёткі) і інш. [6, с. 215]. Аднак актыўныя сацыялагічныя даследаванні пачаліся пасля стварэння Акадэміі навук Беларусі (1929). З канца 1930-х да сярэдзіны 1950-х гг. сацыялогія фактычна не развівалася. З сярэдзіны 1960-х гг. зноў узнік навуковы інтарэс да гэтай навукі. Менавіта ў той час былі заснаваны грамадскі Інстытут сацыялагічных даследаванняў і сектар сацыялогіі ў Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук БССР.

Сучасныя тэрмінасістэмы філасофіі і сацыялогіі фактычна пачалі складвацца з пачатку XX ст. Адпаведныя тэрмінаадзінкі фіксуюцца ў наступных лексікаграфічных крыніцах: «Беларуская навуковая тэрміналогія. Выпуск 11. Грамадазнаўства» (1927) (далей – БНТ-11), «Русско-белорусский словарь общественно-политической терминологии» (далей – РБС-70), які выйшаў у 1970 г. пад рэдакцыяй М. В. Бірылы і М. Р. Судніка, «Беларуская савецкая энцыклапедыя» ў 12 тамах (1969–1975), «Беларуская энцыклапедыя» ў 18 тамах, якая выдавалася з 1996 па 2004 г. (далей – БЭ-96), «Кароткі тлумачальны слоўнік філасофскіх, сацыяльных і культуралагічных тэрмінаў» (1992), энцыклапедычны даведнік для школьнікаў «Чалавек і грамадства» (1998), «Хрысціянскі філасофскі зборнік» (2001), «Беларускі

[1]Тут і далей пераклад наш. – *М. Г.*

палітычны слоўнік» (2011) (далей – БПС-2011). Філасофская тэрміналогія стала асновай дысертацыйнага даследавання Ю. Лук’янюк і была кадыфікавана ў значна большай ступені, чым сацыялагічная, пра што сведчыць выданне ў 1996 г. «Тэрміналагічна-тлумачальнага слоўніка па філасофіі» (далей – ТСФ-96), які змяшчае больш за 900 паняццяў і імёнаў.

Мэтай гэтага артыкула з’яўляецца вызначэнне найбольш прадуктыўных словаўтваральных тыпаў у межах суфіксацыі для беларускіх сацыялагічных і філасофскіх тэрмінаў на матэрыяле наступных крыніц: БНТ-11, РБС-70, ТСФ-96, БЭ-96, БПС-2011.

Тэрмін «словаўтваральны тып» намі разглядаецца як група вытворных слоў, якія валодаюць трыма прыкметамі: 1) адзінствам часціны мовы ўтваральнай асновы; 2) агульнасцю семантычных адносін паміж вытворнымі і ўтваральнымі словамі; 3) агульнасцю спосабу словаўтварэння (пры афіксальным словаўтварэнні – тоеснасцю афікса) [7, с. 102]. Гэтыя тры крытэрыі (граматычны, семантычны, фармальны) выкарыстоўваюцца і іншымі сучаснымі даследчыкамі пры вызначэнні словаўтваральнага тыпу [8, с. 17].

Паняцце прадуктыўнасці/непрадуктыўнасці з’яўляецца, па сутнасці, дыяхранічным, паколькі «прадуктыўнасць ці непрадуктыўнасць афікса ўстанаўліваецца параўнаннем таго, што ёсць зараз, з тым, што было ў мове ў папярэднія часы яе развіцця» [7, с. 45]. Паняцце ж рэгулярнасці/нерэгулярнасці мае сінхранічны характар; рэгулярныя афіксы складаюць вялікія словаўтваральныя парадыгмы. Пры аналізе прадуктыўнасці словаўтваральных тыпаў (падтыпаў) выкарыстоўваецца наступная шкала: высокапрадуктыўным мы лічым тып, да якога належаць не менш за 10 % тэрмінаў, утвораных суфіксальным спосабам, малапрадуктыўным – тып, які аб’ядноўвае менш за 4 % адпаведных адзінак. Прадуктыўнасць асобных суфіксаў вызначаецца з улікам агульнай колькасці суфіксальных утварэнняў.

## Утварэнне абстрактных і зборных назоўнікаў

***Фармант -асць (-асьць).*** Назвы адцягненай прыкметы ўяўляюць сабой адну з 19 словаўтваральных катэгорый суфіксальнага словаўтварэння назоўнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове [8, с. 45–46]. Суфікс *-асць* актыўна выкарыстоўваецца для ўтварэння назоўнікаў з адцягненым значэннем прыкметы, якасці. Таксама словы з суфіксам *-асць* могуць абазначаць наяўнасць таго, што названа ва ўтваральнай аснове прыметніка: *стыхійнасць* ← *стыхійны*, *эпізадычнасць* ← *эпізадычны*. Назоўнікі, матываваныя аддзеяслоўнымі прыметнікамі, абазначаюць схільнасць ці здольнасць да дзеяння, якое названа ва ўтваральнай аснове прыметніка: *раздражняльнасць* ← *раздражняльны*. Як адзначае І. У. Кандраценя, тэрміналагічныя ўтварэнні складаюць значную групу дадзенага тыпу [9, с. 170–171]. Гэты словаўтваральны тып з’яўляецца высокапрадуктыўным у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі: *безадказнасьць*[1], *безьдзяржаўнасьць*, *веразносьлівасьць*, *вольнасьць*, *дзяржаўнасьць*, *мірлівасьць*, *роўнасьць* (БНТ-11); *адчужанасць*, *лаяльнасць*, *маністычнасць*, *метафізічнасць*, *мнагастайнасць*, *партыйнасць* (РБС-70); *амбівалентнасць*, *каштоўнасць*, *казуальнасць*, *маргінальнасць*, *мэтазгоднасць*, *неабарачальнасць*, *патрэбнасць*, *прычыннасць*, *раздражняльнасць* (ТСФ-96); *верагоднасць*, *верацярпімасць*, *выпадковасць*, *грамадзянскасць*, *інварыянтнасць*, *індывідуальнасць*, *ментальнасць*, *спадчыннасць*, *тоеснасць*, *цэласнасць*, *чалавечнасць* (БЭ-96); *агульнасць*, *аселасць*, *галоснасць*, *гетэрагеннасць*, *спекулятыўнасць*, *стабільнасць* (БПС-2011). Такія найменні ўтвараюцца як ад уласнабеларускіх асноў (*няпісьменнасьць*, *сучаснасьць* (БНТ-11); *вечнасць*, *грамадскасць*, *няроўнасць* (РБС-70)), так і ад запазычаных (*апалітычнасьць*, *сувэрэннасьць*, *экстэрыторыяльнасьць* (БНТ-11); *абсалютнасць*, *абстрактнасць*, *акцыдэнтальнасць*, *антаганістычнасць*, *апастэрыёрнасць*, *апрыёрнасць* (РБС-70)).

Некаторыя ўтварэнні з суфіксам *-асьць* перыяду 1920-х гг., якія можна ахарактарызаваць як пурыстычны (*супрацьваяўлівасьць*, *няшлюбнасьць* (БНТ-11)), зніклі з актыўнага ўжытку, яны не фіксуюцца ў «Слоўніку беларускай мовы» (пад рэдакцыяй А. А. Лукашанца) [10], «Слоўніку сучаснай беларускай мовы» У. М. Завальнюка, М. Р. Прыгодзіча, В. К. Раманцэвіч [11], «Вялікім слоўніку беларускай мовы» Ф. М. Піскунова [12]. Колькасны склад утварэнняў з суфіксам *-асць (-асьць)* і іх прадуктыўнасць адлюстраваны ў табл. 1.

Табліца 1

**Прадуктыўнасць суфікса *-асць (-асьць)* у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі**

Table 1

**The productivity of the *-асць (-асьць)* suffix in sociological and philosophical terminology**

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў-назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з суфіксам *-асць (-асьць)* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| БНТ-11 | 180 | 36 | 20,0 |
| РБС-70 | 177 | 93 | 52,5 |

[1]Прыклады з лексікаграфічных крыніц прыводзяцца з захаваннем арфаграфічных асаблівасцей арыгінала. – *М. Г.*

Заканчэнне табл. 1
Ending table 1

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў-назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з суфіксам *-асць (-асьць)* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| ТСФ-96 | 98 | 43 | 43,9 |
| БЭ-96 | 80 | 36 | 45,0 |
| БПС-2011 | 84 | 30 | 35,7 |
| Усяго | 619 | 238 | 38,4 |

Заўвага. Складзена аўтарам.

***Фармант -ств(а) (-зтв(а)) / -цтв(а).*** Гэты словаўтваральны тып з'яўляецца высокапрадуктыўным у тэрміналогіі філасофіі і сацыялогіі.

Аддзеяслоўныя найменні з суфіксам *-ств(а) (-зтв(а))* маюць значэнне працэсуальнай прыкметы: *верхаводзтва ← верхаводзіць* (БНТ-11). Тэрмін *верхаводства* (з паметай, якая абазначае лексіку абмежаванага выкарыстання) зафіксаваны ў «Вялікім слоўніку беларускай мовы» Ф. А. Піскунова [12], аднак адсутнічае ў іншых сучасных лексікаграфічных працах [10; 11].

Адназоўнікавыя найменні з суфіксамі *-ств-/-цтв-* абазначаюць групы людзей: *грамадства*, *насельніцтва*, *чалавецтва* (БПС-2011).

Адпрыметнікавыя найменні з аналагічнымі суфіксамі могуць мець наступнае абагульненае значэнне:

• непрацэсуальная прыкмета: *падабенства ← падобны* (ТСФ-96);

• назва сукупнасці асоб: *асаднiцтва ← асадніцкі*, *магнацтва ← магнацкі*, *мяшчанства ← мяшчанскі* (БНТ-11), *бядняк ← бядняцкі* (РБС-70);

• рэлігійная прыналежнасць: *каталіцтва*, *лютаранства*, *магамэтанства*, *мусульманства*, *паганства* (БНТ-11); *пратэстанцтва*, *пурытанства* (РБС-70), *прэсвітэрыянства* (БЭ-96);

• грамадскія з'явы: *адступніцтва*, *дээртырства*, *згодніцтва*, *здрадніцтва*, *пустэльніцтва* (БНТ-11), *дактрынёрства*, *дыктатарства*, *каланізатарства* (РБС-70), *асветніцтва* (БЭ-96), *месіянства*, *сектанцтва* (БПС-2011);

• напрамкі грамадскай думкі: *еўразійства* (БПС-2011), *заходніцтва*, *народніцтва* (БЭ-96).

Тып, прадстаўлены назоўнікамі, утворанымі ад прыметнікаў з суфіксамі *-ск- (-цк-)*, *-ыянск-* (*кантыянства ← кантыянскі*, *канфуцыянства ← канфуцыянскі*, *картэзіянства ← картэзіянскі* (БЭ-96)), з'яўляецца прадуктыўным у сучаснай беларускай літаратурнай мове [13, с. 258].

Некаторыя вытворныя назоўнікі могуць разглядацца як суадносныя адначасова з прыметнікамі і назоўнікамі: *дактрынёрства ← дактрынёрскі* і *дактрынёр*, *пустэльніцтва ← пустэльніцкі* і *пустэльнік* і інш. «Аднак той факт, што ў саставе вытворных паўтараюцца структурныя кампаненты адпаведных адносных прыметнікаў, сведчыць аб тым, што назоўнікі з суфіксам *-ств-* утвараюцца толькі ад прыметнікаў: *Кант → кантыянскі → кантыянства*» [13, с. 258].

Колькасны склад тэрмінаўтварэнняў з фармантам *-ств(а) (-зтв(а))* / *-цтв(а)* і іх прадуктыўнасць паказаны ў табл. 2.

Табліца 2

**Прадуктыўнасць фарманта *-ств(а) (-зтв(а)) / -цтв(а)* у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі**

Table 2

**The productivity of the *-ств(а) (-зтв(а)) / -цтв(а)* word-formation formant in sociological and philosophical terminology**

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў-назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з фармантам *-ств(а) (-зтв(а))* / *-цтв(а)* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| БНТ-11 | 180 | 32 | 17,8 |
| РБС-70 | 177 | 22 | 12,4 |
| ТСФ-96 | 98 | 9 | 9,2 |
| БЭ-96 | 80 | 14 | 17,5 |
| БПС-2011 | 84 | 9 | 10,7 |
| Усяго | 619 | 86 | 13,9 |

Заўвага. Складзена аўтарам.

***Фармант -нн(е) (-ньн(е)).*** Як адзначаецца ў «Беларускай граматыцы», «назоўнікі з фармантамі *-нн(е)*, *-енн(е)/-энн(е)* маюць значэнне апрадмечанага дзеяння. Утваральнымі з'яўляюцца пераважная

большасць дзеясловаў вытворных і невытворных: *абагульняць → абагульненне*, *назіраць → назіранне*» [13, с. 259–260]. Фармант *-нн(е)* ужываецца пры ўтварэнні назоўнікаў ад пераходных дзеясловаў, пры гэтым дзеяслоўная аснова цалкам уключаецца ў вытворнае слова: *паўстаць → паўстанне*. Утварэнне назоўнікаў пры дапамозе фарманта *-нн(е)* з'яўляецца высокапрадуктыўным у тэрміналогіі філасофіі і сацыялогіі.

У 1920-я гг. тэрміны з суфіксам *-нн(е)* утвараліся пераважна ад беларускіх асноў: *аб'яднаньне*, *апекаваньне*, *вераваньне*, *выгнаньне*, *змаганьне*, *панаваньне*, *учалавечваньне* (БНТ-11).

У пазнейшы перыяд тэрміналагічныя адзінкі з суфіксам *-нн(е)* пачалі ўтварацца як ад запазычаных, так і ад беларускіх асноў. Напрыклад, у РБС-70 зафіксаваны наступныя лексемы, утвораныя ад асноў іншамоўнага паходжання: *абстрагаванне ← абстрагаваць*, *дэкласаванне ← дэкласаваць*, *прагназаванне ← прагназаваць*, *рэфлектаванне ← рэфлектаваць*, *стымуляванне ← стымуляваць*, *суб'ектывіраванне ← суб'ектывіраваць*; тэрміны, утвораныя ад уласнабеларускіх асноў: *панаванне ← панаваць*, *галасаванне ← галасаваць*, *выхаванне ← выхаваць*, *разважанне ← разважаць*, *спажыванне ← спажываць*, *сузіранне ← сузіраць*.

Застаецца высокапрадуктыўным гэты словаўтваральны тып і на сучасным этапе: *мадэляванне*, *абгрунтаванне*, *апасродкаванне*, *апрадмечванне*, *распрадмечванне* (ТСФ-96); *гіпастазаванне* (БПС-2011). Колькасныя паказчыкі вытворных тэрмінаў з фармантам *-нн(е) (-ньн(е))* прыведзены ў табл. 3.

Табліца 3

**Прадуктыўнасць фарманта *-нн(е) (-ньн(е))* у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі**

Table 3

**The productivity of the *нн(е) (-ньн(е))* word-formation formant in sociological and philosophical terminology**

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў – абстрактных назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з фармантам *-нн(е) (-ньн(е))* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| БНТ-11 | 180 | 17 | 9,4 |
| РБС-70 | 177 | 18 | 10,2 |
| ТСФ-96 | 98 | 16 | 16,3 |
| БЭ-96 | 80 | 12 | 15,0 |
| БПС-2011 | 84 | 5 | 6,0 |
| Усяго | 619 | 68 | 11,0 |

Заўвага. Складзена аўтарам.

*Фармант -енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))*. Фармант *-енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))* далучаецца да інфінітыўнай асновы пасля зычнага, пры гэтым інфінітыўны галосны адсякаецца. У якасці матывавальных слоў выступаюць дзеясловы з інфінітыўнай асновай на *-і*, *-а* [14, с 158]: *мысленне ← мысліць* (РБС-70), *выцясненьне ← выцясняць* (БНТ-11). Утварэнні маюць значэнне адцягненай працэсуальнай прыкметы. Дадзены словаўтваральны тып дастаткова прадуктыўны пры ўтварэнні сацыялагічных і філасофскіх тэрмінаў: *перанасяленьне ← перанасяліць*, *расьсяленьне ← расьсяліць* (БНТ-11); *адмаўленне ← адмовіць*, *адрозненне ← адрозніць*, *суджэнне ← судзіць*, *тлумачэнне ← тлумачыць* (РБС-70); *абвяржэнне ← абвяргаць*, *адрозненне ← адрозніць*, *арэчаўленне ← арэчавіць* (ТСФ-96); *акружэнне ← акружыць*, *змяненне ← змяніць* (БПС-2011). Колькасныя паказчыкі вытворных тэрмінаў з фармантам *-енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))* паказаны ў табл. 4.

Некаторыя тэрмінаадзінкі пурыстычнага перыяду з гэтым фармантам (*удухаўленьне* (дублет да *анімізм*, БНТ-11), *высваеньне* (дублет да *экспрапрыяцыя*, БНТ-11)) не фіксуюцца ў сучасных лексікаграфічных працах [10–12].

Табліца 4

**Прадуктыўнасць фарманта *-енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))* у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі**

Table 4

**The productivity of the *-енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))* word-formation formant in sociological and philosophical terminology**

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў – абстрактных назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з фармантам *-енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| БНТ-11 | 180 | 22 | 12,2 |
| РБС-70 | 177 | 10 | 5,6 |

Заканчэнне табл. 4
Ending table 4

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў – абстрактных назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з фармантам *-енн(е)/-энн(е) (-еньн(е)/-эньн(е))* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| ТСФ-96 | 98 | 16 | 16,3 |
| БЭ-96 | 80 | 6 | 7,5 |
| БПС-2011 | 84 | 2 | 2,4 |
| Усяго | 619 | 56 | 9,0 |

Заўвага. Складзена аўтарам.

***Фармант -(л)ізм/-ызм.*** Адцягненыя назоўнікі са значэннем назваў грамадска-палітычных і навуковых напрамкаў, вучэнняў часта ўтвараюцца ад назоўнікавых асноў пры дапамозе запазычанага суфікса *-ізм/-ызм*: *дэмакратызм*, *ідэалізм* [7, с 112]. Гэты словаўтваральны тып дастаткова прадуктыўны ў тэрміналогіі філасофіі і сацыялогіі: *браманізм*, *патрыятызм*, *тотэмізм*, *шаманізм* (БНТ-11); *іерагліфізм*, *субстанцыялізм* (РБС-70); *гільдэізм*, *мюрыдызм*, *татэмізм* (БЭ-96); *аскетызм*, *гегеманізм*, *рытуалізм*, *фаварытызм*, *экалагізм* (БПС-2011). Адпрыметнікавыя ўтварэнні з гэтым фармантам называюць грамадска-палітычныя, навуковыя і эстэтычныя катэгорыі, сістэмы, якасці [11, с 219]: *еўрапеізм* ← *еўрапейскі* (БПС-2011), *інстынктывізм* ← *інстынктыўны* (БЭ-96), *казуалізм* ← *казуальны* (РБС-70). Сустракаюцца адзінкавыя ўтварэнні, матываваныя прыслоўямі: *апастэрыярызм* ← *апастэрыёры*, *апрыярызм* ← *апрыёры* (РБС-70). У сучасны перыяд прадуктыўнасць утварэнняў з суфіксам *-(л)ізм*/*-ызм* узрастае ў сувязі з агульнай тэндэнцыяй да інтэрнацыяналізацыі.

Колькасны склад утварэнняў з суфіксам *-(л)ізм*/*-ызм* і іх прадуктыўнасць адлюстраваны ў табл. 5.

Табліца 5

**Прадуктыўнасць суфікса *-(л)ізм/-ызм* у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі**

Table 5

**The productivity of the *-(л)ізм/-ызм* suffix in sociological and philosophical terminology**

| Крыніца | Агульная колькасць суфіксальных утварэнняў-назоўнікаў | Агульная колькасць утварэнняў з суфіксам *-(л)ізм*/*-ызм* | Прадуктыўнасць, % |
|---|---|---|---|
| БНТ-11 | 180 | 4 | 2,2 |
| РБС-70 | 177 | 8 | 4,5 |
| ТСФ-96 | 98 | 4 | 4,1 |
| БЭ-96 | 80 | 9 | 11,3 |
| БПС-2011 | 84 | 14 | 16,7 |
| Усяго | 619 | 39 | 6,3 |

Заўвага. Складзена аўтарам.

***Фармант -ацыj(а).*** На сучасным этапе расце прадуктыўнасць запазычанага суфікса *-ацыj-*, пры дапамозе якога ўтвараюцца адцягненыя назоўнікі ад дзеяслоўных асноў. Як правіла, такія тэрміны суадносяцца з дзеясловамі на *-аваць* або *-іраваць*. РБС-70 (усяго каля 17 000 слоў) утрымлівае 5 тэрмінаў з гэтым фармантам: *абсалютызацыя* ← *абсалютызаваць*, *бюракратызацыя* ← *бюракратызаваць*, *дэмакратызацыя* ← *дэмакратызаваць*, *субстанцыялізацыя* ← *субстанцыялізаваць*, *фашызацыя* ← *фашызаваць*, а БПС-2011 (каля 3300 тэрмінаў і ўласных імёнаў) фіксуе 11 аналагічных утварэнняў: *вестэрнізацыя* ← *вестэрнізаваць*, *глабалізацыя* ← *глабалізаваць*, *ідэнтыфікацыя* ← *ідэнтыфікаваць*, *інстытуцыяналізацыя* ← *інстытуцыяналізаваць*, *лібералізацыя* ← *лібералізаваць*, *маргіналізацыя* ← *маргіналізаваць*, *матывацыя* ← *матываваць*, *палітызацыя* ← *палітызаваць*, *папулярызацыя* ← *папулярызаваць*, *пралетарызацыя* ← *пралетарызаваць*, *фемінізацыя* ← *фемінізаваць*.

***Нульсуфіксальнае ўтварэнне.*** Такі тып утварэння тэрмінаў-назоўнікаў з'яўляецца малапрадуктыўным. Нульсуфіксальным спосабам тэрміны ўтвараюцца ад асноў наступных часцін мовы:

• дзеясловаў (назоўнікі мужчынскага роду: *вызыск* ← *вызыскаць*, *занялад* ← *занепадаць* (БНТ-11), *прыгнёт* ← *прыгнятаць* (РБС-70); назоўнікі жаночага роду: *забясьпека* ← *забясьпечыць*, *заняволя* ← *заняволіць* (БНТ-11), *развага* ← *разважыць* (РБС-70));

• прыметнікаў: *моладзь* ← *малады* (ТСФ-96), *нефармал* ← *нефармальны* (БПС-2011);

• назоўнікаў: *олігарх* ← *олігархія* (БНТ-11).

Сярод непрадуктыўных суфіксальных словаўтваральных мадэлей у тэрміналогіі сацыялогіі і філасофіі можна назваць утварэнні з наступнымі фармантамі: ***-ак*** (*звышак* (БНТ-11)), ***-анн(е)*** (*прадбачанне* (БЭ-96)), ***-от(ы)*** (*даброты* (РБС-70)), ***-ык(а)*** (*глабалістыка* (БПС-2011)).

## Утварэнне *Nomina Agentis*

***Суфікс -нік.*** З дапамогай суфікса *-нік* агентыўныя назоўнікі ўтвараюцца ад наступных часцін мовы і іх форм:

• субстантатываў: *абшарнік ← абшар*, *асаднік ← асада*, *асьветнік ← асьвета*, *ахоўнік ← ахова*, *згоднік ← згода*, *здраднік ← здрада*, *змоўнік ← змова*, *касьцёльнік ← касьцёл*, *мяцежнік ← мяцеж*, *работнік ← работа*, *сусьветнік ← сусьвет* (БНТ-11); гэты тып з'яўляецца прадуктыўным у сучаснай беларускай мове [13, с. 223];

• дзеясловаў: *бунтаўнік ← бунтаваць*, *насельнік ← насяляць*, *прадстаўнік ← прадстаўляць* (БНТ-11); аддзеяслоўнае ўтварэнне лічыцца прадуктыўным у тэрміналогіі [13, с. 222];

• дзеепрыметнікаў: *выбраньнік ← выбраны* (БНТ-11); гэты тып адносіцца да малапрадуктыўных [13, с. 223].

***Суфікс -ік.*** Адпрыметнікавыя назоўнікі абазначаюць асоб як носьбітаў прыкметы, названай утваральным словам: *саматужнік ← саматужны*, *сучасьнік ← сучасны*, *царкоўнік ← царкоўны* (БНТ-11); *заходнікі ← заходні* (ТСФ-96). Гэты словаўтваральны тып з'яўляецца высокапрадуктыўным у сучаснай беларускай мове [13, с. 222]. Трэба заўважыць, што тэрмін «заходнік» мае дзве ўтваральныя асновы: *заходнік* (чалавек, які жыве на захадзе) ← *захад*; *заходнік* (чалавек, які прытрымліваецца заходніх каштоўнасцей) ← *заходні* [15, с. 130].

***Суфікс -льнік.*** Назоўнікі з гэтым суфіксам утвараюцца ад дзеясловаў, абазначаюць асоб паводле дзеяння, названага ўтваральным словам: *аб'яднальнік ← аб'яднаць*, *выбіральнік ← выбіраць*, *застрашальнік ← застрашаць* (усяго тры тэрміны ў БНТ-11).

***Суфіксы -енец/-ец.*** Утварэнні з суфіксам *-ец* больш шырока прадстаўлены ў БНТ-11, чым у пазнейшых крыніцах (ТСФ-96, БЭ-96, БПС-2011). Назоўнікі з гэтымі суфіксамі матывуюцца наступнымі асновамі:

• дзеяслоўнымі: *заняволец ← занявольваць*, *пасяленец ← пасяліцца*, *перасяленец ← перасяляцца*, *усяленец ← усяляць* (БНТ-11), *адшчапенец ← адшчапіць* (БПС-11); тып малапрадуктыўны [13, с. 235];

• прыметнікавымі: *бернштэйніянец ← бернштэйніянскі*, *вальтэр'янец ← вальтэр'янскі*, *гегельянец ← гегельянскі*, *кантыянец ← кантыянскі* (РБС-70); *мірлівец ← мірлівы*, *паступовец ← паступовы*, *прамысловец ← прамысловы* (БНТ-11); тып прадуктыўны [13, с. 235].

***Фармант -іст (-іст(ы))*** застаецца высокапрадуктыўным на працягу ўсяго разглядаемага перыяду: суфікс *-іст* актыўна ўдзельнічаў у словаўтваральным працэсе з пачатку ХХ ст. У «Беларускай граматыцы» адрозніваюцца адназоўнікавыя і адпрыметнікавыя ўтварэнні з гэтым фармантам, прычым першы тып валодае ўніверсальнай прадуктыўнасцю, а другі прызнаецца прадуктыўным толькі ў межах спецыяльнай тэрміналогіі [13, с. 233–234].

У БНТ-11 прадуктыўным з'яўляўся фармант *-іст(ы)*: *анархісты*, *атэісты*, *гуманісты*, *імпэрыялісты*, *колёністы*, *комуністы*, *опортуністы*, *пацыфісты*, *соцыялісты*.

У крыніцах больш позняга перыяду выдзяляюцца дзве групы ўтварэнняў з суфіксам *-іст*/*-ыст* у залежнасці ад віду ўтваральнай асновы:

• утварэнні, матываваныя агульнымі назоўнікамі: *расіст ← ра́са* (БПС-2011). У некаторых выпадках пры гэтым адбываецца ўсячэнне фіналей утваральных асноў: ***-ізм*** (*абсэнтэіст ← абсэнтэізм*, *валюнтарыст ← валюнтарызм*, *сацыяліст ← сацыялізм*, *спірытуаліст ← спірытуалізм* (РБС-70), *экстрэміст ← экстрэмізм* (БПС-2011), *трансцэндэнталіст ← трансцэндэнталізм* (ТСФ-96)), ***-ij-*** (*утапіст ← утопія* (БПС-2011));

• маскулінатывы, якія ўтварыліся ад уласных назоўнікаў: *бабувіст* – ад франц. *Babeuf G.*, *бакуніст* – ад рус. Бакунин М. А. (РБС-70).

Малапрадуктыўнымі фармантамі для ўтварэння агентыўных назоўнікаў з'яўляюцца ***-ц(а)*** (*абаронца* (БНТ-11)), ***-цель*** (*вызваліцель*, *пакарыцель* (БНТ-11)), ***-шчык*** (*выбаршчык* (РБС-70)), ***-ар*** (*уладар* (БНТ-11)), ***-ін*** (*гараджанін* (БНТ-11)), ***-ун*** (*апякун* (БНТ-11)), ***-як*** (*бядняк* (РБС-70)).

Такім чынам, у стварэнні тэрмінаў сацыялогіі і філасофіі выкарыстоўваюцца тыя ж спосабы словаўтварэння, якія пашыраны ў агульналітаратурнай мове. У межах гэтых тэрмінасістэм найбольш прадуктыўнымі фармантамі з'яўляюцца *-асць (-асьць)*, *-ств(а) (-зтв(а))/цтв(а)*. У 1920-я гг. высокапрадуктыўнымі былі словаўтваральныя тыпы з фармантамі *-асьць*, *-ств(а) (-зтв(а))* / *цтв(а)*, *-еньн(е)/-эньн(е)*; дастаткова прадуктыўным з'яўляўся словаўтваральны тып з фармантам *-ньн(е)*; малапрадуктыўным – з суфіксам *-(л)ізм*/*-ызм*. У пазнейшы перыяд фарманты *-асць*, *-ств(а )* / *цтв(а)* захавалі

сваю высокую прадуктыўнасць, да іх далучыўся фармант *-нн(е)*; фармант *-енн(е)*/*-энн(е)* можна таксама ахарактарызаваць як прадуктыўны. Суфікс *-ізм*/*-ызм* быў малапрадуктыўным у 1920–80-я гг., але на сучасным этапе прадуктыўнасць такіх утварэнняў (а таксама ўтварэнняў з запазычаным суфіксам *-ацыj-*) павышаецца, што звязана з агульнай тэндэнцыяй да інтэрнацыяналізацыі. Некаторыя ўтварэнні пурыстычнага перыяду з прадуктыўнымі фармантамі (*супрацьвваяўлівасьць*, *няшлюбнасьць*, *удухаўленьне*, *высваеньне* і інш.) выйшлі з актыўнага ўжытку. Для ўтварэння *Nomina Agentis* прадуктыўнымі з'яўляюцца фарманты *-ік*/*-нік*/*-льнік*, *-енец*/*-ец*, *-іст (-іст(ы))*.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Антанюк Л. А.* Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне. Мінск, 1987.
2. *Даниленко В. П.* Русская терминология. Опыт лингвистического описания. М., 1977.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка [і інш.]. Мінск, 1996.
4. *Скікевіч А. А., Шчур У. С.* Тэрміналагічна-тлумачальны слоўнік па філасофіі. Мінск, 1996.
5. *Майхровіч А. С.* Філасофская думка Беларусі ў кантэксце еўрапейскай філасофіі // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Мінск, 2008. Т. 2 : Протарэнесанс і Адраджэнне / С. У. Санько [і інш.]. 2010. С. 14–35.
6. *Сакалова Г. М.* Сацыялогія // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск, 1996–2004. Т. 14 : Рэле – Слаявіна. 2002. С. 214–215.
7. *Шакун Л. М.* Словаўтварэнне. Мінск, 1978.
8. *Лукашанец А. А.* Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння. Мінск, 2013.
9. *Кондратеня И. В.* Наименование отвлеченного признака // Сопоставительное описание русского и белорусского языков. Словообразование / А. В. Андреева [и др.] ; науч. ред.: А. А. Лукашанец [и др.]. Минск, 2014. С. 170–176.
10. Слоўнік беларускай мовы / уклад.: Н. П. Еўсіевіч [і інш.] ; навук. рэд.: А. А. Лукашанец [і інш.]. Мінск, 2012.
11. *Завальнюк У. М., Прыгодзіч М. Р., Раманцэвіч В. К.* Слоўнік сучаснай беларускай мовы / пад агул. рэд. М. Р. Прыгодзіча [і інш.]. 2-е выд. Мінск, 2010.
12. *Піскуноў Ф. А.* Вялікі слоўнік беларускай мовы : арфаграфія, акцэнтуацыя, парадыгматыка : каля 223 000 слоў. Мінск, 2012.
13. Беларуская граматыка : у 2 ч. / пад рэд. М. В. Бірылы [і інш.]. Мінск, 1985–1986. Ч. 1 : Фаналогія. Арфаграфія. Марфаналогія. Словаўтварэнне. Націск. 1985.
14. *Кондратеня И. В.* Наименование действия и состояния // Сопоставительное описание русского и белорусского языков. Словообразование / А. В. Андреева [и др.] ; науч. ред.: А. А. Лукашанец [и др.]. Минск, 2014. С. 157–170.
15. *Бардовіч А. М., Круталевіч М. М., Лукашанец А. А.* Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы. Мінск, 2000.

## References

1. Antoniuk L. A. Belaruskaja navukovaja tjerminalogija: farmiravanne, struktura, uparadkavanne, kanstrujavanne, funkcyjaniravanne [Belarusian scientific terminology: formation, structure, systematization, construction, functioning]. Minsk, 1987 (in Belarus.).
2. Danilenko V. P. Russkaya terminologiya. Opyt lingvisticheskogo opisaniya [Russian terminology: an experience of linguistic description]. Moscow, 1977 (in Russ.).
3. Tlumachal'ny slownik belaruskaj litaraturnaj movy [The dictionary of the Belarusian literary language] : more than 65 000 words. Minsk, 1996 (in Belarus.).
4. Skikevich A. A., Shchur U. S. Tjerminalagichna-tlumachal'ny slownik pa filasofii [Terminological philosophical dictionary]. Minsk, 1996.
5. Maikhrovich A. S. Filasofskaja dumka Belarusi w kantjeksce ewrapejskaj filasofii [Belarusian philosophical thought in the context of European philosophy]. In: *Gistoryja filasofskaj i gramadska-palitychnaj dumki Belarusi* : in 6 vol. Minsk, 2008. Vol. 2 : Protarjenesans i Adradzhjenne. 2010. P. 14–35 (in Belarus.).
6. Sakalova G. M. Sacyjalogija [Sociology]. In: *Belaruskaja jencyklapedyja* : in 18 vol. Minsk, 1996–2004. Vol. 14 : Rjele – Slajavina. 2002. P. 214–215 (in Belarus.).
7. Shakun L. M. Slovawtvarjenne [Word Formation]. Minsk, 1978 (in Belarus.).
8. Lukashanets A. A. Prablemy suchasnaga belaruskaga slovawtvarjennja [The problems of contemporary Belarusian word formation]. Minsk, 2013 (in Belarus.).
9. Kondratenia I. V. Naimenovanie otvlechennogo priznaka [The name of abstact attribute]. In: *Sopostavitel'noe opisanie russkogo i belorusskogo yazykov. Slovoobrazovanie*. Minsk, 2014. P. 170–176 (in Russ.).
10. Slownik belaruskaj movy [The Belarusian language dictionary]. Minsk, 2012 (in Belarus.).
11. Zaval'niuk U. M., Prygodzich M. R., Ramancjevich V. K. The contemporary Belarusian language dictionary. 2nd ed. Minsk, 2010 (in Belarus.).
12. Piskunou F. A. Vjaliki slownik belaruskaj movy : arfagrafija, akcjentuacyja, paradygmatyka [The Great dictionary of the Belarusian language : spelling, accentuation, paradigmatic] : about 223 000 words. Minsk, 2012 (in Belarus.).
13. Belaruskaja gramatyka [Belarusian grammar] : in 2 parts. Minsk, 1985–1986. Part 1 : Fanalogija. Arfagrafija. Marfanalogija. Slovawtvarjenne. Nacisk. 1985 (in Belarus.).
14. Kondratenia I. V. Naimenovanie deistviya i sostojanija [The name of action and state]. In: *Sopostavitel'noe opisanie russkogo i belorusskogo jazykov. Slovoobrazovanie*. Minsk, 2014. P. 157–170 (in Russ.).
15. Bardovich A. M., Krutalevich M. M., Lukashanets A. A. Slovawtvaral'ny slownik belaruskaj movy [The Word formation dictionary of the Belarusian language]. Minsk, 2000 (in Belarus.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 18.11.2016.*
*Received by editorial board 18.11.2016.*